# ГАВОРКІ ВЫГАНАЎСКАГА ПАЛЕССЯ

*Яраслаў Самуйлік (Брэст)*

Выганаўскае Палессе – рэгіён на сумежжы Берасцейска-Пінскага Палесся і Панямоння. Размешчаны ён у міжрэччы Ясельды (прыток Прыпяці) і Шчары (прыток Нёмана). У межах Выганаўскага Палесся знаходзяцца азёры Выганашчанскае (26 км²), Бабровіцкае (9,47 км²) і інш. У дадзеным рэгіёне праходзіць Агінскі канал, які злучае Ясельду са Шчарай, пабудаваны ў 1767–1783 гг. Адміністрацыйна – гэта ў асноўным паўднёвая частка Івацэвіцкага раёна (Целяханшчына, цэнтр – мястэчка Целяханы) і прылягаючыя тэрыторыі Ганцавіцкага і Пінскага раёнаў Брэсцкай вобласці. Выганаўскае Палессе знаходзіцца пераважна на поўначы Заходняга Палесся, на мяжы з Панямоннем. Геаграфічна і гістарычна названы рэгіён займае своеасаблівае прамежкавае становішча паміж "тыповым" Заходнім Палессем і Панямоннем, а ў этнаграфічным аспекце з'яўляецца месцам сутыкнення чатырох буйных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі: Паўночна-Заходняга, або Панямоння, Цэнтральнай Беларусі, Усходняга Палесся і Заходняга Палесся.

У значнай колькасці навуковых прац Выганаўскае Палессе паказваецца як сумежжа паміж найбольш буйнымі дыялектнымі адзінкамі – панямонскай (гродзенска-баранавіцкай) і заходнепалескай (брэсцка-пінскай) групамі гаворак [1, с. 402; 2, карта № 71; 3]. І як мяркуюць некаторыя даследчыкі, гэты рэгіён асобай цікавасці не ўяўляе. Тут проста суіснуюць моўныя асаблівасці, уласцівыя як гродзенска-баранавіцкім, так і заходнепалескім гаворкам. Пытанні дыялектнай сітуацыі на тэрыторыі Выганаўскага Палесся даследаваліся мала. Так, Н.Т. Вайтовіч выдзеліла паўночнабрэсцкія гаворкі, у склад якіх уключана і асноўная частка гаворак даследуемага рэгіёна [4]. Ф.Д. Клімчук удакладніў межы паўночнабрэсцкіх гаворак, адзначыў некаторыя адметнасці, якія іх дыферэнцыруюць, а таксама на падставе фанетычных рыс выдзеліў больш дробныя адзінкі – паўднёвацеляханскія і валішчанска-аброўскія гаворкі [5, с. 7–12, 38–39; 6]. Па тэрыторыі Выганаўскага Палесся праходзіць значная колькасць ізаглос [2; 7; 8; 9].

Таму для больш дакладнага вызначэння структуры мясцовых гаворак і характару моўных працэсаў было вырашана даследаваць дадзены рэгіён лінгвагеаграфічным метадам, пры гэтым аб'ектам вывучэння сталі гаворкі амаль усіх населеных пунктаў.

Фактычны матэрыял намі збіраўся і апрацоўваўся на працягу 1985–2009 гг. Даследаванні праводзіліся пераважна ў паўднёвай частцы Івацэвіцкага і на сумежнай тэрыторыі Пінскага, Ганцавіцкага, а таксама Бярозаўскага, Драгічынскага, Кобрынскага і Столінскага раёнаў Брэсцкай вобласці, Жыткавіцкага і Клецкага раёнаў адпаведна Гомельскай і Мінскай абласцей.

У 2009 г. намі быў выдадзены рэгіянальны лінгвістычны атлас "Гаворкі Выганаўскага Палесся" [10]. Сетка атласа складаецца з дзвюх частак: асноўнай (26 населеных пунктаў) і дадатковай (8 населеных пунктаў). У агульнай колькасці абследаваны гаворкі 34 населеных пунктаў, з іх у Івацэвіцкім – 23, Пінскім – 4, Драгічынскім – 2, у Ганцавіцкім, Кобрынскім, Столінскім, Клецкім і Жыткавіцкім раёнах – па аднаму

населенаму пункту. Аўтарам асабіста сабраны дыялектны матэрыял у 27 вёсках. Шэсць населеных пунктаў па нашай просьбе абследавалі навуковыя супрацоўнікі НАН Беларусі (Ф.Д. Клімчук, П.А. Міхайлаў, Т.В. Кузьмянкова, В.Л. Вярэніч, М.А. Саскевіч), адну – выкладчык Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна М.М. Аляхновіч. Апытванне праводзілася па адмыслова распрацаванай праграме пад назвай "Як у вас гавораць?". Праграма налічвае 117 пытанняў, з іх 38 – па фанетыцы, 33 – па марфалогіі і 46 – па лексіцы. Як правіла, даследавалася мова інфарматараў ад 40 да 90 гадоў.

У лінгвістычным атласе "Гаворкі Выганаўскага Палесся" ўсяго 154 карты, з іх 12 уступныя (№ I–XII) і 142 лінгвістычныя. На ўступных картах пададзена сучаснае адміністрацыйнае дзяленне гэтай тэрыторыі (№ I), пашырэнне лясных і балотных масіваў у сярэдзіне XX ст. (№ II), карта этнаграфічных рэгіёнаў (па В.С. Цітову; № III), карта сучаснага дыялектнага члянення гаворак Выганаўскага Палесся (№ IV), гістарычныя карты (V–XII). Лінгвістычныя карты прысвечаны фанетыцы (56 карт, з іх 24 – вакалізму і 32 – кансанантызму), марфалогіі (33 карты), лексіцы (53 карты).

Паводле праведзеных даследаванняў, у гаворках Выганаўскага Палесся назіраюцца значныя адрозненні на ўзроўні фанетыкі, марфалогіі і лексікі. Таму гаворкі рэгіёна падзяляюцца шматлікімі ізаглосамі, якія аб'яднаны ў пучкі. Апошнія ў сваю чаргу на тэрыторыі Выганаўскага Палесся ўтвараюць чатыры асноўныя групы (серыі): *паўночную*, *паўднёвую*, *цэнтральную* і *лакальныя* пучкі ізаглос [10; 11; 12; 13; 14; 15; 16; 17; 18; 19; 20; 21; 22; 23; 24; 25].

Пучкам ізаглос таксама ўласціва свая спецыфіка. Часта яны аб'ядноўваюць дзве і болей дыялектныя адзінкі. У той жа час нярэдка часткі двух і болей пучкоў зліваюцца. Дыялектныя адзінкі характарызуюцца агульнасцю моўных асаблівасцей (фанетыка, марфалогія, лексіка). Таму пучкі ізаглос не заўсёды з'яўляюцца межамі паміж групамі гаворак. Аднак на падставе пучкоў ізаглос такія межы ўстаноўлены. Пры гэтым вельмі дакладна, паколькі ў названым рэгіёне даследаваны амаль усе вёскі. Унутранае адзінства асобных груп (падгруп) устаноўлена на багатым фактычным матэрыяле, які дае лінгвістычны атлас "Гаворкі Выганаўскага Палесся" [10].

Такім чынам, паводле вынікаў праведзеных даследаванняў на тэрыторыі Выганаўскага Палесся вылучаюцца наступныя групы і падгрупы гаворак. На поўначы рэгіёна бытуюць гродзенска-баранавіцкія (панямонскія) гаворкі. На большай частцы яго тэрыторыі (цэнтральная частка) пашыраны паўночнабрэсцкія гаворкі, пераважна іх ц э н т р а л ь н а ц е л я х а н с к а я падгрупа, у цэнтры – гаворка мястэчка (гарадскога пасёлка) Целяханы. На поўдзень ад названых гаворак бытуюць паўднёвацеляханскія гаворкі; на крайнім поўдні рэгіёна – валішчанска-аброўскія, паўночна- і сярэднезагародскія гаворкі (гл. рысунак 1). Пры супастаўленні асобых груп гаворак Выганаўскага Палесся назіраецца наступнае. Паўночнабрэсцкія гаворкі суадносяцца з паўночнапалескім тыпам, паўднёвацеляханскія – са стрыгінскім, валішчанска-аброўскія – з малецкім, паўночна- і сярэднезагародскія – з паўднёвапалескім, гаворка мястэчка Целяханы – з беражноўскім [26; 27].

Разгледзім больш падрабязна названыя гаворкі.

Рысунак 1. Гаворкі Выганаўскага Палесся і наваколляў




А — гродзенска-баранавіцкія (панямонскія)
Б — паўночнабрэсцкія
В — гаворка г.п. Целяханы
Г — паўднёвацеляханскія
Д — валішчанска-аброўскія
Е — паўночназагародскія і сярэднезагародскія

– – – – Межы гаворак
........... Цэнтральнацеляханская падгрупа паўночнабрэсцкіх гаворак

## Гродзенска-баранавіцкія (панямонскія) гаворкі

Гродзенска-баранавіцкія (панямонскія) гаворкі пашыраны на поўначы даследуемага рэгіёна. Асноўны іх масіў знаходзіцца ў басейне ракі Нёман. На поўдні яны непасрэдна мяжуюць з паўночнабрэсцкімі гаворкамі (гл. рысунак 1). Дадзеная мяжа праходзіць з крайняга паўночнага захаду ад в. Гічыцы, далей на поўдзень ад названага населенага пункта, потым на поўнач ад вв. Вяда, Тупічычы, Выганашчы Івацэвіцкага і в. Раздзялавічы Ганцавіцкага раёнаў. У гэтым мікрарэгіёне на ўзмежжы гродзенска-баранавіцкіх і паўночнабрэсцкіх гаворак размешчаны значныя лясныя і балотныя масівы, Выганашчанскае і Бабровіцкае азёры [10, карта № II; 28, с. 15].

Сучасная дыялектная мяжа паміж гродзенска-баранавіцкімі і паўночнабрэсцкімі (цэнтральнацеляханскімі) гаворкамі супадае або амаль супадае з былымі межамі Чорнай

Русі і Пінскага княства (XII–XIII стст.), Новагародскага (Навагрудскага) і Берасцейскага (Брэсцкага) ваяводства (з канца XVI – да канца XVIII ст.), Слонімскага і Кобрынскага паветаў Гродзенскай губерні і Навагрудскім і Пінскім паветамі Мінскай губерні ( канца XIX – да пачатку XX ст.). Дадзеныя фактары, у прыватнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльныя межы, а таксама лясныя і балотныя масівы аказалі значны ўплыў на фарміраванне дыялектнай мяжы гродзенска-баранавіцкіх гаворак з паўночнабрэсцкімі гаворкамі [10, карты № II, VII–XI].

Гродзенска-баранавіцкая (панямонская) група гаворак выдзелена ў 1964 г. Р.І. Аванесавым [1, с. 382–403]. Яна адносіцца да паўднёва-заходняга дыялекту беларускай мовы. Гродзенска-баранавіцкая група займае большую частку тэрыторыі Гродзенскай вобласці, апрача паўночна-ўсходняй часткі, а таксама паўночную частку Брэсцкай і суседнія мікрарэгіёны Мінскай вобласці [2; 29, с. 58; 30; 31; 32].

Дадзеныя гаворкі непасрэдна мяжуюць з паўночнабрэсцкімі гаворкамі, да якіх яны найбольш блізкія, найбольш аддаленыя – ад гаворак валішчанска-аброўскіх і сярэднезагародскіх.

Гаворкі гродзенска-баранавіцкай (панямонскай) групы па сваёй структуры блізкія да беларускай літаратурнай мовы. Пры характарыстыцы гэтых гаворак, апрача нашага лінгвістычнага атласа "Гаворкі Выганаўскага Палесся", мы выкарысталі таксама іншыя выданні: "Дыялекталагічны атлас беларускай мовы" і "Лексічны атлас беларускіх народных гаворак" [7; 8; 10].

Гродзенска-баранавіцкім гаворкам характэрны наступныя асаблівасці[1]: васьміфанемны склад галосных гукаў – [*і*], [*ы*], [*е(э)*], [*ê*], [*а*], [*о*], [*ô*], [*у*]; галосны [*а*] на месцы ***о*** ў пераднаціскных складах пасля цвёрдых зычных /няпоўнае недысімілятыўнае а к а н н е/ *(галава́, даро́га, каро́ва, малако́, се́но, ле́то, садо́к, трава́* і інш.); галосны [*а*] на месцы ***е***, ***ѣ*** у першым пераднаціскным складзе пасля губных і пярэднеязычных ***д***, ***т***, ***з***, ***с***, ***н*** /недысімілятыўнае я к а н н е/ *(вясна́, бяда́, мяшо́к, дзянёк, зямля́, сяло́)*; пераважна галосныя [*о*], [*ô*] на месцы ***о*** ў новых закрытых складах пад націскам *(воз, нос, стол; вôз, нôс, стôл)*; пераважна галосныя [*е*], [*ê*] на месцы націскнога ***ѣ*** *(лес, се́но, снег; лêс, сêно, снêг)*; галосны [*а*] на месцы ***ę*** ў пераднаціскным і паслянаціскным складзе ў лексемах *глядзе́ў, злякау́ся, злякаўцца, заяц, памяць;* захаванне ***ы*** ў націскным і першым пераднаціскным складзе пасля губных зычных *(бык, вы, выпі, высоко, высыпаў, грыбы́, мы, мыш, памы́ю, пыл* і інш.); галосны [*ы*] пасля зычнага [*б*] у словаформах *быў, была́, было́, былі́;* мяккія губныя і пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***е***, ***ѣ*** ***і*** *(вясна́, мёд, бераг, вечар, да мяне́, першы, бяда́, мяшо́к, дзянёк, зямля́, сяло́, поле, ліпа, міска, рабі́ць, зіма́, хадзі́ць)*; мяккія і паўмяккія ***д***, ***т*** перайшлі ў палатальныя [*дз"*], [*ц"*] *(дз"ен', ц"ап'ер, хадз"іц", ц"іхо, дз"ед, ц"ен', ходз"іц", ходз"ац")*; мяккія заднеязычныя ў гістарычных спалучэннях ***гы***, ***кы***, ***хы*** *(доўгі, кароткі, ціхі)*; толькі цвёрды зычны ***р*** *(град, грэх, парадак, парэзаў, рэчка, кароўка* і інш.); толькі цвёрдыя шыпячыя *(жар, жыто, на мяжы, шапка* і інш.); гістарычны мяккі ***ц*** паслядоўна ацвярдзеў *(маладзіца, хлопцы, цацка, цэўка, цэп)*; пераважна адсутнасць падаўжэння зычных або захаванне спалучэння ***-лj-***, ***-нj-*** у пазіцыі паміж галоснымі *(зеле, насене, восеню; зелье, насенье, восенью* і інш.); пераважна аглушэнне звонкіх у канцавым становішчы і ў сярэдзіне слова перад глухімі *(вос, дуп, каска, загатка)*; паўгалосны [*ў*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы *(праўда, доўгі, купіў)*;

[1] У нашай працы разглядаюцца толькі фанетычныя і марфалагічныя адметнасці даследуемых гаворак.

пераважна адсутнасць эпентычных зычных перад гістарычным націскным *ę пасля мяккага губнога *м *(мясо, мята* і інш.); прыстаўныя зычныя [*в*], [*г*] у словах *восень, вочы, вуліца (восень, вочы, вуліца; госень, гочы, гуліца);* ужыванне злучніка і часціцы *ці;* канчаткі *-ём (-ом)* назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне *(канём, рублём, нажом, яйцом);* націскны канчатак *-э (-е)* назоўнікаў мужчынскага роду множнага ліку другога скланення з цвёрдай, мяккай і зацвярдзелай асновай у назоўным склоне *(сталэ, дубэ, луге, баке, кавале, нажэ* і інш.); націскны канчатак *-ох* назоўнікаў мужчынскага роду множнага ліку другога скланення з цвёрдай і зацвярдзелай асновай у месным склоне *(у лясох, на лугох, на нажох* і інш.); ненаціскны канчатак *-оё* прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(маладоё, староё);* формы асабова-ўказальных займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *ён, яна, яно, яны;* формы інфінітыва з асновай на галосны з суфіксам *-ць (хадзіць, рабіць, спаць);* формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве з постфіксам *-ца (брацца, звацца, рабіцца, умывацца);* формы інфінітыва з асновай на [*к*] *(пячы, сячы);* формы *пякуць, стрыгуць* дзеясловаў першага спражэння з асновай на [*г*], [*к*] у трэцяй асобе множнага ліку; формы *ідзеце, ідзêце, нясеце, нясêце, глядзеце, глядзêце, сядзеце, сядзêце* дзеясловаў першага і другога спражэння ў другой асобе множнага ліку загаднага ладу; дзеяслоўныя формы *лятаць, летаюць* з націскам на другім складзе асновы *(лятаць, лятаюць)* і інш.

Такім чынам, гродзенска-баранавіцкія (панямонскія) пучкі ізаглос (паўночная група) у нашай працы паказваюць, што значная колькасць ізаглос, што акрэсліваюць моўныя асаблівасці, уласцівыя панямонскім гаворкам, паступова пашыраецца на ўсе гаворкі Выганаўскага Палесся, утвараючы асобныя пучкі.

## Паўночнабрэсцкія гаворкі

Паўночнабрэсцкія гаворкі на поўначы мяжуюць з гродзенска-баранавіцкімі (панямонскімі) гаворкамі. Яны ўпершыню былі выдзелены ў 1968 г. Н.Т. Вайтовіч. Паўночнабрэсцкія гаворкі суадносяцца з паўночнапалескім дыялектным тыпам [2; 4; 5; 25, с. 217; 26; 27; 30, с. 202–203; 31; 32; 33]. Асноўная частка дадзеных гаворак на тэрыторыі Выганаўскага Палесся па сваіх моўных адметнасцях адносіцца да цэнтральнацеляханскай падгрупы. Паўночнабрэсцкія гаворкі, у тым ліку цэнтральнацеляханская падгрупа, мяжуюць з наступнымі гаворкамі рэгіёна (гл. рысунак 1): з гродзенска-баранавіцкімі (на поўначы), паўднёвацеляханскімі (на паўднёвым захадзе), валішчанска-аброўскімі (на паўднёвым захадзе і паўднёвым усходзе) і мікраарэалам гаворкі мястэчка Целяханы (на поўдні).

У межах Выганаўскага Палесся да паўночнабрэскіх гаворак адносяцца гаворкі вв. Бабровічы, Вулька Аброўская, Вулька Целяханская, Выганашчы, Вяда, Вялікая Гаць, Горталь, Гутка, Доўгая, Жытлін, Козікі, Краі, Малая Гаць, Раздзялавічы, Святая Воля, Соміна, Тупічычы. Большасць гэтых гаворак належаць да цэнтральнацеляханскай падгрупы (акрамя гаворак вв. Жытлін і Раздзялавічы).

Цэнтральнацеляханская падгрупа паўночнабрэсцкіх гаворак аддзяляецца ад гродзенска-баранавіцкіх, валішчанска-аброўскіх, паўднёвацеляханскіх і гаворкі мястэчка Целяханы значнай колькасцю ізаглос.

Цэнтральнацеляханскай падгрупе гаворак уласцівы наступныя асаблівасці: сяміфанемны склад галосных гукаў – [*і*], [*ы*], [*е(э)*], [*ê(э̂)*], [*а*], [*о*], [*у*]; захаванне ***о** ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных /о к а н н е/ *(голова, дорога, корова, молоко, сено, сено, лето, лето, садок, трава* і інш.); галосны [*э̂(ê)*] на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам *(вэ̂з, вêз, нэ̂с, стэ̂л);* пераважна галосны [*ы*] на месцы ***о** ў прыназоўніку *пад (пыд);* пераважна галосны [*ê*] на месцы націскнога ***ѣ** *(лêс, сêно, снêг);* пераважна паслянаціскны галосны [*о*] ў слове *вецер (вêцёр, вецёр);* пераважна галосны [э] на месцы ***е**, ***ѣ** ў першым пераднаціскным складзе пасля цвёрдых губных *(вэсна, бэда, мэшок);* захаванне ***е** ў першым пераднаціскным складзе пасля мяккіх пярэднеязычных ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н** /е к а н н е/ *(дзенёк /дз$^{д}$енёк, денёк/, земля, село);* галосныя [*е*], [э] на месцы ***ę** ў пераднаціскным і паслянаціскным складзе ў лексемах *глядзеў, злякаўся, злякацца, заяц, памяць (гледзев /гледзеў, гледз$^{д}$ев, гледев/, злекавса, злекацца, злекацiса, заец, памэць, памець /памэц$^{т}$ь, памэть/);* пераважна захаванне ***ы** ў націскным і першым пераднаціскным складзе пасля губных зычных *(бык, вы, выпі высоко, высыпав /высыпаў/, грыбы, мы, мыш, помыю, пыл* і інш.); пераважна захаванне націскнога ***ы** ў словах тыпу *сын, валы, рыба, дым (сын, волы, рыба);* пераважна галосны [*у*] пасля зычнага [*б*] у словаформах *быў, была, было, былі (був /буў/, була, було, булі);* пераднаціскны галосны [*е*] у словаформе *яйцом (ейцэм);* пераважна цвёрдыя губныя перад рэфлексамі ***е** /ва ўсіх пазіцыях/, ***ѣ** /у ненаціскных складах/ *(вэсна, васна, мэд, бэрог, вэчор, до мэне, до мане, пэршы бэда, бада, мэшок, машок);* мяккія пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***е** *(дзенёк /дз$^{д}$енёк, денёк/, земля, село, поле);* мяккія губныя і пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***і** *(міска, робіці, /робіць, робіц$^{т}$і, робіті/, ліпа, зіма, ходзіці, /ходзіць, ходз$^{д}$іц$^{т}$і, ходіті/);* мяккія і паўмяккія ***д**, ***т** перайшлі пераважна ў палаталізаваныя [*дз'*], [*ц'*], зрэдку – у мяккія [*дз$^{д}$'*], [*ц$^{т}$'*] *(дз'ен', ц'епэр, ц'епэра /ц'епэрака/, ц'еп'ер, ходз'іц'і, ц'іхо, дз'ед, ц'ен'; дз$^{д}$'ен', ц$^{т}$'епэр, ходз$^{д}$'іц$^{т}$'і, ц$^{т}$'іхо, дз$^{д}$'ед, ц$^{т}$'ен');* на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку мяккі ***т** пераважна ацвярдзеў *(ходз'іт, ходз'ат /ходз$^{д}$'іт, ходз$^{д}$'ат, ход'іт, ход'ат/);* пераважна цвёрдыя губныя і заднеязычныя перад канчаткам *-эй* у назоўніках жаночага роду множнага ліку роднага склону *(бабэй, головэй, ямэй, дорогэй, стрэхэй);* пераважна цвёрдыя заднеязычныя перад [э] *(довгэе, довгэ /доўгэе/, короткэе, короткэ, ціхэе, ціхэ /ц$^{т}$іхэе, ц$^{т}$іхэ, тіхэе, тіхэ);* мяккія зычныя перад рэфлексамі націскнога ***ѣ** *(вецер, лес, сено, снег, вêцёр, лêс, сêно, снêг* і інш.); пераважна цвёрдыя зычныя перад рэфлексамі ***о** ў новых закрытых складах пад націскам *(вэ̂з, вэ̂л, корэ̂вка, нэ̂с, стэ̂л, кэ̂нь);* мяккія заднеязычныя ў гістарычных спалучэннях ***гы**, ***кы**, ***хы** *(довгі /доўгі/, короткі, ціхі /ц$^{т}$іхі, тіхі/);* пераважна цвёрды і паўмяккі зычны ***р**, зрэдку мяккі ***р** захаваўся *(град, грэх, порадок порэзав, /порэзаў/, рэчка, корэ̂вка; гр˙ад, гр˙эх, пор˙адок, пор˙эзав, р˙эчка, кор˙э̂вка* і інш.; *грех, порядок, порезав, речка);* пераважна цвёрдыя шыпячыя *(жар, жыто, на мэжэ /на межэ/, шапка* і інш.); толькі цвёрды гістарычны мяккі ***ц** *(молодзіца /молодз$^{д}$іца, молодіца/, хлопцы, цацка, цэвка /цэўка/, цэп);* пераважна падоўжаныя зычныя [*л'л'*], [*н'н'*] на месцы спалучэнняў ***-лj-**, ***-нj-** у пазіцыі паміж галоснымі *(зелле, насенне);* пераважна захаванне звонкіх зычных у канцавым становішчы і ў сярэдзіне слова перад глухімі *(вэ̂з, веꓕз, дуб, казка, сказка, загадка);* пераважна губна-губны [*w*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы *(праwда, доwгі, купіw);* пераважна эпентычны зычны [*н'*] перад гістарычным націскным ***ę** пасля ацвярдзелага губнога ***м** *(мнясо, мнята, помняв /помняў/, цемне /ц$^{т}$емне, темне);* пераважна ўжыванне злучніка і часціцы *чы* [ці];

пераважна канчаткі *-ем (-эм)* назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне *(конем, рублем, ножэм, ейцэм);* канчатак -э назоўнікаў мужчынскага роду адзіночнага ліку другога скланення з асновай на зацвярдзелы зычны ў месным склоне *(на дворэ, на двор'э, на концэ);* канчатак -э назоўнікаў жаночага роду адзіночнага ліку першага скланення з асновай на зацвярдзелы зычны ў месным склоне *(на мэжэ, на межэ, на мажэ);* канчатак *-і* назоўнікаў жаночага, мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку першага і другога скланення з цвёрдай і мяккай асновай у месным склоне *(у (в) хаці /у (в) хац$^{т}$і, у (в) хаті/, у (в) лесі, у (в) носі, у (в) полі);* формы агульных назоўнікаў і ўласных імёнаў жаночага роду адзіночнага ліку ў клічным склоне *(бабо, мамо; мама* /не заўсёды/, *Маня, Валя);* пераважна канчатак *-эй (-ей)* назоўнікаў жаночага роду множнага ліку першага скланення ў родным склоне *(бабэй, бабей, головэй, головей, дорогэй, дорогей, стрэхэй, стрэхей, хатэй, ямэй, ямей);* канчатак *-ям* назоўнікаў мужчынскага роду множнага ліку другога скланення ў давальным склоне *(коням, людзям /людз$^{д}$ям, людям/);* націскны і ненаціскны канчатак *-ы* прыметнікаў мужчынскага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молоды, малы, стары, добры, новы, хорошы);* паралельнае ўжыванне націскных канчаткаў *-ая, -а* або толькі націскнога канчатка *-ая* прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молодая старая; молода, стара);* пераважна паралельнае ўжыванне ненаціскных канчаткаў *-ая, -а* прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(добрая, новая; добра, нова);* паралельнае ўжыванне націскных канчаткаў *-эе, -э* або толькі націскнога канчатка *-эе* прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молодэе, старэе; молодэ, старэ);* пераважна паралельнае ўжыванне ненаціскных канчаткаў *-эе (-ее), -э (-е)* прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(новэе, новее, салодкэе, солодкее, хорошэе; новэ, нове, солодкэ, солодке, хорошэ);* формы асабова-ўказальных займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *вэн, вён, вона, воно, воны;* формы інфінітыва з асновай на галосны пераважна з суфіксам *-ці,* зрэдку *-ц$^{т}$і (ходзіці, робіці, спаці; ходз$^{д}$'іц$^{т}$і, робіц$^{т}$і, спац$^{т}$і);* формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве пераважна з постфіксам *-са (браціса /брац$^{т}$іса, братіса, брацiс/, зваціса /звац$^{т}$іса, зватіса, звацiс/, мыціса, мыціс, робіціса /робіц$^{т}$іса, робітіса, робіціс/, умываціса, /умывац$^{т}$іса, умыватіса, умываціс/);* формы інфінітыва з асновай на [*к*] *(пэкці, пекці; пэкце /пекце, пэкц$^{т}$е, пэкте/; секці /секц$^{т}$і, секті/);* дзеяслоўныя формы *лятаць, летаюць з* націскам на першым складзе асновы *(летаці, /летаць, летац$^{т}$і, летаті/, летают /летаюць/);* формы дзеясловаў *хадзіць, насіць* у першай асобе адзіночнага ліку *(ходзю /ходз$^{д}$ю, ходю/, носю);* цвёрды зычны [*с*] у зваротнай форме дзеяслова *(боюса, купаюса, боявса, купавса, /купаўса/, зробілосо /зробілос/);* пераважна формы *ходз'іт, ходз'ат /ходз$^{д}$'іт, ходз$^{д}$'ат, ход'іт, ход'ат/* дзеясловаў другога спражэння ў трэцяй асобе адзіночнага і множнага ліку з націскам на аснове; пераважна формы *пэкут, пэкуць /пекут/, стрыгут, стрыгуць* дзеясловаў першага спражэння з асновай на [*г*], [*к*] у трэцяй асобе множнага ліку; пераважна формы *весят /весяць/* дзеяслова *вісець* у трэцяй асобе множнага ліку і інш.

Шэраг спецыфічных адметнасцей цэнтральнацеляханскай падгрупы паўночнабрэсцкіх гаворак утвараюць дзве дыялектныя мікрападгрупы: у с х о д н е ц е л я х а н с к у ю і з а х о д н е ц е л я х а н с к у ю.

Спецыфічнымі асаблівасцямі ўсходнецеляханскай мікрападгрупы з'яўляюцца: галосны [*і*] на месцы ***ы** ў націскным і першым пераднаціскным складзе пасля губных

зычных *(бік, ві, віпі, вісоко, вісыпав /вісыпаў/, грыбі, мі, міш, помію, піл* і інш.); галосны [*ы*·][2] на месцы націскнога ***ы** ў словах тыпу *сын, валы, рыба, дым (сы·н, волы·, ры·ба);* галосны [*і*] на месцы ***о** ў прыназоўніку *пад (під);* мяккія губныя перад рэфлексамі ***е**, ***ѣ** *(весна, мед, берог, вечор, до мене, першы, беда, мешок);* мяккія губныя і заднеязычныя перад канчаткам *-ей* у назоўніках жаночага роду множнага ліку роднага склону *(бабей, головей, ямей, дорогей, стрехей);* мяккія заднеязычныя перад [*е*] *(довгее, довге, короткее, коротке, ціхее /ціхе/);* мяккія губныя і заднеязычныя перад рэфлексамі ***о** ў новых закрытых складах пад націскам *(вêз, кêнь);* наяўнасць паўмяккага зычнага ***р** *(гр˙ад, гр˙эх, пор˙адок, пор˙эзав, р˙эчка* і інш.); мяккі зычны [*в'*] у прыметнікавай форме *новае (нове, новее);* уласна-асабовы займеннік другой асобы множнага ліку *ві* і інш.

Спецыфічнымі адметнасцямі заходнецеляханскай мікрападгрупы з'яўляюцца: галосны [*а*] на месцы ***е**, ***ѣ** ў першым пераднаціскным складзе пасля цвёрдых губных *(васна, бада, машок);* галосны [*ы*$^{у}$] пасля зычнага [*б*] у словаформах *быў, была, было, былі (бы*$^{у}$*в, бы*$^{у}$*ла, бы*$^{у}$*ло, бы*$^{у}$*лі);* палаталізаваны [*ц'*] на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку *(ходз'іц', ходз'ац');* наяўнасць мяккіх і паўмяккіх шыпячых *(жяр, на мэже, на меже, шяпка; ж˙ито);* частковае аглушэнне звонкіх зычных у сярэдзіне слова перад глухімі *(каз*$^{с}$*ка, сказ*$^{с}$*ка, загад*$^{т}$*ка);* адпадзенне пачатковага гука ў лексеме *ануча (нуча);* канчатак *-ямі* назоўніка *грудзі* ў творным склоне *(грудзямі)* і інш.

Фарміраванне дыялектнага ландшафту даследуемага рэгіёна мае сваю спецыфіку.

У станаўленні гаворак Выганаўскага Палесся адыгрывалі, відаць, пэўную ролю міграцыйныя (пераважна мікраміграцыйныя) рухі і міждыялектныя кантакты. Паводле археалагічных крыніц, дадзены рэгіён быў заселены яшчэ да канца эпохі палеаліту (X–VII стст. да н.э.) [10, карга № V; 34, с. 67–68, 299–301, 477; 35, с. 21–124; 36, с. 41–43; 37, с. 383; 38, с. 78–79, 406–408; 39, с. 165–166; 40, с. 11, 19–23; 41]. Трэба зазначыць таксама, што многія даследчыкі праводзяць паміж арэаламі сучасных заходнепалескіх і панямонскіх гаворак старажытную балта-славянскую этнічную мяжу. Яна ўмоўна праходзіла ў міжрэччы Ясельды і Шчары.

Прыкладна ў X ст. у Выганаўскім Палессі ўзнікаюць адносна пастаянныя паселішчы. Да X–XIII стст. адносіцца значная колькасць славянскіх курганаў у рэгіёне. Размешчаны яны ў заходняй (вв. Жытлін, Корачын, Хадакі) і цэнтральнай (в. Святая Воля; захавалася 9 курганаў) частцы Выганаўскага Палесся. Да таго ж часу адносяцца курганы і іншыя помнікі на тэрыторыях, якія прымыкаюць да гэтага рэгіёна: у цэнтральнай і паўночна-заходняй частцы Івацэвіцкага (раён гарадоў Івацэвічы, Косава, в. Быцень), на поўначы Пінскага (в. Бакінічы, вв. Сошна – Вылазы), на поўдні Ганцавіцкага (вв. Малькавічы, Люсіна), на поўначы Іванаўскага раёна (в. Лядавічы) [10, карта № VI; 42, с. 7–9, 16–17; 43, с. 17, 19–20, 24–25; 44, с. 56–58, 103–104, 110–114].

У X–XIII стст. даследуемы рэгіён быў заселены славянамі, хоць шчыльнасць насельніцтва была невысокай. Нашчадкі таго насельніцтва працягвалі жыць у гэтым краі і ў наступныя стагоддзі, жывуць і зараз. Можна меркаваць, што пазней мелі месца прылівы насельніцтва ў Выганаўскае Палессе з іншых рэгіёнаў, у першую чаргу з суседніх.

Як мы ўжо сцвярджалі (гл. гродзенска-баранавіцкія гаворкі), наклалі адбітак на дыялектны ландшафт Выганаўскага Палесся і колішнія дзяржаўныя і адміністрацыйныя

---

2 [ы·] – галосны верхняга пад'ёму пярэдняга (пярэдне-сярэдняга) рада.

межы. Так, сучасная дыялектная мяжа паміж цэнтральнацеляханскай падгрупай паўночнабрэскіх гаворак і панямонскімі гаворкамі амаль супадае з былой мяжой Пінскага княства (да пачатку 70-х гадоў уваходзіла ў склад Тураўскага княства) з Чорнай Руссю XII–XIII стст., а потым з Літвой часоў Міндоўга [10, карта VII]. Відавочна, у даследуемым рэгіёне не было поўнай дыялектнай аднароднасці і ў старажытныя часы, калі пачаў фарміравацца яго дыялектны ландшафт. А ў пазнейшыя часы наяўнасць местачковых цэнтраў (Целяханы, Івацэвічы, Лагішын, Выганашчы, Хатынічы) у Выганаўскім Палессі і яго наваколлі спрыяла, па-першае, вылучэнню мікрагруп мясцовых гаворак, па другое, іх кансалідацыі і захаванню.

Цэнтральнацеляханская падгрупа, як састаўная частка паўночнабрэсцкіх гаворак, характарызуецца цэлым комплексам моўных асаблівасцей. А паўночнабрэсцкія гаворкі, як вядома, вельмі блізкія да гаворак усходнепалескай часткі слуцка-мазырскай групы паўднёва-заходняга дыялекту беларускай мовы. Яны з'яўляюцца, безумоўна, адзінымі з гэтымі гаворкамі па сваёй дыялектнай аснове і выступаюць фактычна іх працягам, хоць і своеасаблівым, па геаграфіі. Паўночнабрэсцкія гаворкі ўтвараюць адносна нешырокі пояс, які прымыкае да ізаглоснай мяжы паміж заходнепалескамі гаворкамі і гаворкамі асноўнага масіву беларускай мовы. Загадкавым і незвычайным з'яўляецца, безумоўна, гэты пояс усходнепалескіх гаворак па яго ўтварэннні і паходжанні. Аднак гэта загадка для гістарычнай дыялекталогіі [30, с. 203].

Такім чынам, цэнтральнацеляханская падгрупа паўночнабрэсцкіх гаворак выступае як выразна акрэсленая дыялектная адзінка даўняга ўтварэння, якая адасобілася ад іншых груп.

## Паўднёвацеляханскія гаворкі

Паўднёвацеляханскія гаворкі пашыраны ў невялікім арэале, што размешчаны на паўднёвы захад ад мястэчка Целяханы. Яны бытуюць на ўзмежжы Івацэвіцкага (пераважна) і Пінскага раёнаў. Паўднёвацеляханскія гаворкі як асобная дыялектная адзінка была выдзелена Ф.Д. Клімчуком у 1983 г. Даследчыкі звычайна адносяць гэтыя гаворкі да берасцейска-пінскіх. Паўднёвацеляханскія гаворкі суадносяцца са стрыгінскім дыялектным тыпам [5, с. 10–11; 25, с. 217; 26; 27; 30, с. 204].

На тэрыторыі даследуемага рэгіёна дадзеныя гаворкі на поўначы мяжуюць (гл. рысунак 1) з паўночнабрэсцкімі і мікраарэалам гаворкі мястэчка Целяханы, на захадзе і ўсходзе – з валішчанска-аброўскімі, на поўдні – з сярэднезагародскімі гаворкамі.

Паўднёвацеляханскія гаворкі аддзяляюцца ад сярэднезагародскіх, валішчанска-аброўскіх, паўночнабрэсцкіх і гаворкі мястэчка Целяханы значнай колькасцю ізаглос.

Паўднёвацеляханскім гаворкам характэрны наступныя асаблівасці: сяміфанемны склад галосных гукаў – [*і*], [*ы*], [*е(э)*], [*ê(э̂)*], [*а*], [*о*], [*у*]; галосны [*э̂*] на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам *(вэ̂з, нэ̂с, стэ̂л);* галосны [*ê*] на месцы націскнога ***ѣ** *(лêс, сêно, снêг);* захаванне ***о** ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных /о к а н н е/ *(голова́, доро́га, коро́ва, молоко́, се́но, ле́то, садо́к, трава́* і інш.); галосны [э] на месцы ***е, *ѣ** ў першым пераднаціскным складзе пасля цвёрдых губных і пярэднеязычных ***д, *т, *з, *с, *н** *(вэсна́, бэда́, мэшо́к, дэнёк, зэмля́, сэло́);* галосныя

[*е*], [э] на месцы *ę ў пераднаціскным складзе ў лексемах *глядзеў, злякаўся, злякацца, заяц, памяць (гледев, злекавса, злекатіса, злекацца, заец, памэть);* захаванне ***ы** ў націскным і першым пераднацiскным складзе пасля губных зычных *(бык, вы, выпі, высоко, высыпав, грыбы, мы, мыш, помыю, пыл* і інш.); захаванне націскнога ***ы** ў словах тыпу *сын, валы, рыба, дым (сын, волы, рыба);* галосны [*у*] пасля зычнага [*б*] у словаформах *быў, была, было, былі (був, була, було, булі);* цвёрдыя губныя перад рэфлексам ***е** /ва ўсіх пазіцыях/, ***Ѣ** /у ненацiскных складах/ *(вэсна, мэд, бэрог, вэчор, до мэнэ, пэршы, бэда, мэшок);* цвёрдыя пярэднеязычныя (акрамя ***л**) перад рэфлексамі ***е** *(дэнь, дэнёк, зэмля, сэло; тэпэр, поле);* мяккія губныя і пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***і** *(міска, робіті, ліпа, зіма, ходіті);* адсутнасць дзекання-цекання *(ход'іт'і, т'іхо, д'ед, т'ен');* цвёрдыя губныя і заднеязычныя перад канчаткам *-эй* у назоўніках жаночага роду множнага ліку роднага склону *(бабэй, головэй, ямэй, дорогэй, стрэхэй);* цвёрдыя заднеязычныя перад [э] *(довгэе, довгэ, короткэе, короткэ, тіхэе, тіхэ);* мяккія заднеязычныя у гістарычных спалучэннях ***гы**, ***кы**, ***хы** *(довгі, короткі, тіхі);* цвёрды [*т*], этымалагiчны мяккі [*т'*] на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку *(ход'іт, ход'ат; ход'іт', ход'ат');* толькі цвёрды зычны ***р** *(град, грэх, порадок, порэзав, рэчка, корэ̂вка* і інш.); толькі цвёрдыя шыпячыя *(жар, жыто, на мэжэ, шапка);* толькі цвёрды гістарычны мяккі ***ц** *(молодіца, хлопцы, цацка, цэвка, цэп);* падоўжаныя зычныя [*л'л'*], [*н'н'*] на месцы спалучэнняў ***-лј-**, ***-нј-** у пазіцыі паміж галоснымі *(зелле, насенне);* захаванне, аглушэнне, частковае аглушэнне звонкіх зычных у канцавым становішчы і ў сярэдзіне слова перад глухімі *(вэ̂з, дуб, казка, загадка; вэ̂с, дуп, каска, загатка; вэ̂з$^с$, дуб$^п$, сказ$^с$ка, загад$^т$ка);* губна-губны [*w*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы *(праwда, доwгі, купіw);* эпентычны зычны [*н'*] перад гістарычным націскным *ę пасля ацвярдзелага губнога ***м** *(мнясо, мнята, помняв, темне);* канчаткі *-ем (-эм)* назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне *(конем, рублем, ножэм, ейцэм);* канчатак -э назоўнікаў мужчынскага роду адзіночнага ліку другога скланення з асновай на зацвярдзелы зычны ў месным склоне *(на дворэ, на концэ);* канчатак -э назоўнікаў жаночага роду адзіночнага ліку першага скланення з асновай на зацвярдзелы зычны ў месным склоне *(на мэжэ);* канчатак *-і* назоўнікаў жаночага, мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку першага і другога скланення з цвёрдай і мяккай асновай ў месным склоне *(у (в) хаті, у (в) лесі, у (в) носі, у (в) полі);* формы агульных назоўнікаў і ўласных імёнаў жаночага роду адзіночнага ліку ў клічным склоне *(бабо, мамо; мама, Маня, Валя);* пераважна канчатак *-эй* назоўнікаў жаночага роду множнага ліку першага скланення ў родным склоне *(бабэй, головэй, дорогэй, стрэхэй, хатэй, ямэй);* націскны і ненацiскны канчатак *-ы* прыметнікаў мужчынскага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молоды, малы, стары, добры, новы, хорошы);* пераважна націскны канчатак *-ая* прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молодая, старая);* ненацiскныя канчаткі *-ая, -а* прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(добрая, новая, добра, нова);* націскныя і ненацiскныя канчаткі *-эе, -э* прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молодэе, старэе, молодэ, старэ; новэе, солодкэе, хорошэе, новэ, солодкэ, хорошэ);* формы асабова-ўказальных займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *вэ̂н, вона, воно, воны;* формы інфінітыва з асновай на галосны з фанематычным варыянтам суфікса *-ці -ті (ходіті, робіті, спаті);* формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве з постфіксам *-са*

*(братіса, зватіса, робітіса, умыватіса);* формы інфінітыва з асновай на [*к*] *(пэкте; секті, сэкті);* формы дзеясловаў *хадзіць насіць* у першай асобе адзіночнага ліку *(ходю, носю);* цвёрды зычны [*с*] у зваротнай форме дзеяслова *(боюса, купаюса, боявса, купавса, зробілосо /зробілос/);* формы *ход'іт, ход'ат, ход'іт', ход'ат'* дзеясловаў другога спражэння ў трэцяй асобе адзіночнага і множнага ліку з націскам на аснове; формы *пэкут, пэкуть, стрыгут, стрыгуть* дзеясловаў першага спражэння з асновай на [*г*], [*к*] у трэцяй асобе множнага ліку і інш.

Такім чынам, паўднёвацеляханскія гаворкі выступаюць як выразна акрэсленая дыялектная адзінка даўняга ўтварэння, якая адасобілася ад іншых груп.

## Гаворка мястэчка Целяханы

Гаворка мястэчка Целяханы лакалізуецца ў цэнтры даследуемага рэгіёна. Яна ўпершыню была выдзелена Самуйлікам Я.Р. у лінгвістычным атласе "Гаворкі Выганаўскага Палесся" (2009). Гаворка мястэчка Целяханы суадносіцца з беражноўскім дыялектным тыпам [10, карта № IV; 25, с. 217; 26; 27].

Дадзеная гаворка знаходзіцца на ўзмежжы арэалаў паўночнабрэсцкіх (цэнтральнацеляханская падгрупа) і паўднёвацеляханскіх гаворак (гл. рысунак 1). Таму яна характарызуецца значнай ступенню пераходнасці. Паводле нашага даследавання значная колькасць ізаглос адрознівае гаворку Целяхан ад цэнтральнацеляханскай падгрупы паўночнабрэсцкіх і паўднёвацеляханскіх гаворак.

Гэтая гаворка па шэрагу адметнасцей аб'ядноўваецца з цэнтральнацеляханскай падгрупай паўночнабрэсцкіх гаворак, па многіх асаблівасцях – з паўднёвацеляханскімі гаворкамі. Шэраг адметнасцей аб'ядноўвае гаворку мястэчка Целяханы з панямонскімі гаворкамі, супрацьпастаўляючы яе асноўным масівам суседніх гаворак, паўночнабрэсцкім і паўднёвацеляханскім.

Дадзеныя асаблівасці ў арэальным плане ўтвараюць своеасаблівы "клін", які цягнецца ад Выганаўскага возера ўздоўж Агінскага канала. Гэта дае падставы меркаваць, што па тэрыторыі адзначанага "кліна" здаўна праходзіў гандлёвы шлях, які злучаў старадаўнія гарады Пінск і Слонім. Падмацоўваецца наша думка наступным. Слонім знаходзіцца на рацэ Шчары. Адзін са старадаўніх гандлёвых шляхоў, які злучаў Балтыйскае мора з Чорным морам, ішоў па рацэ Нёман, затым па яго прытоку Шчары і даходзіў да Выганаўскага возера. Тут неабходна было пераадолець Выганаўскае Палессе і трапіць у раку Ясельду, прыток Прыпяці, якія адносяцца да басейна Чорнага мора. Вядома таксама, што колішнія купцы пры пераездах выкарыстоўвалі так званыя "стругі". Гэта паніжэнні, якія запаўняліся вадой у час веснавых і асенніх паводак. Да нашага часу захаваліся ўрочышчы з назвай "Струга" (звычайна гэта сенажаць) [45, с. 6–8; 46, с. 40–42].

Гаворцы мястэчка Целяханы ўласцівы наступныя адметнасці: васьміфанемны склад галосных гукаў: [*і*], [*ы*], [*е(э)*], [*ê*], [*а*], [*о*], [*ô*], [*у*]; галосныя [*о*], [*ô*] на месцы ***о** ў новых закрытых складах пад націскам *(воз, нос, стол; вôз, нôс, стôл);* галосныя [*е*], [*ê*] на месцы націскнога ***ѣ** *(лес, сено, снег; лêс, сêно, снêг);* захаванне ***о** ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных /о к а н н е/ *(голова, дорога, корова, молоко, сено, сêно, лето, лêто, садок, трава* і інш.); захаванне ***о** або галосны [*ô*] у прыназоўніку *пад (под; пôд);* паслянаціскныя галосныя [*е*], [*о*] ў слове *вецер (вецер; вецёр);* галосны [э]

на месцы ***е**, ***ѣ** ў першым пераднаціскным складзе пасля цвёрдых губных *(вэ́сна, бэ́да, мэшо́к);* захаванне ***е** ў першым пераднаціскным складзе пасля мяккіх пярэднеязычных ***д**, ***т**, ***з**, ***с**, ***н** /е к а н н е/ *(денёк, земля́, село́);* галосныя [*е*], [э] на месцы ***ę** ў пераднаціскным і паслянаціскным складзе ў лексемах *глядзе́ў, злякаўся, злякацца, заяц, памяць (гледе́в, гледзе́в, злекавса, злекатіса, заец, памэть, памэць);* захаванне ***ы** ў націскным і першым пераднаціскным складзе пасля губных зычных *(бык, вы, выпі, высоко, высыпав, грыбы, мы, мыш, помыю, пыл* і інш.); захаванне націскнога ***ы** ў словах тыпу *сын, валы, рыба, дым (сын, волы, рыба);* цвёрдыя губныя перад рэфлексамі ***е** /ва ўсіх пазіцыях/, ***ѣ** /у ненаціскных складах/ *(вэсна, мэд, бэрог, вэчор, до мэне, пэршы, бэда, мэшок);* мяккія пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***е** *(денёк земля, село, поле);* мяккія губныя і пярэднеязычныя перад рэфлексамі ***і** *(міска, робіті, ліпа, зіма, ходіті);* адсутнасць дзекання-цекання *(д'ен', т'епэр, ход'іт'і, т'іхо, д'ед, т'ен');* цвёрдыя губныя і заднеязычныя перад канчаткам *-эй* у назоўніках жаночага роду множнага ліку роднага склону *(бабэй, головэй, ямэй, дорогэй, стрэхэй);* цвёрдыя заднеязычныя перад [э] *(довгэе, короткэе, тіхэе);* мяккія заднеязычныя у гістарычных спалучэннях ***гы**, ***кы**, ***хы** *(довгі, короткі, тіхі);* цвёрды [*т*] канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку *(ход'іт, ход'ат);* наяўнасць паўмяккага зычнага ***р** *(гр'ад, гр'эх, пор'адок, пор'эзав, р'эчка* і інш.); толькі цвёрдыя шыпячыя *(жар, жыто, на мэжэ, шапка);* толькі цвёрды гістарычны мяккі ***ц** *(молодіца, хлопцы, цацка, цэвка, цэп);* захаванне спалучэнняў ***-лј-**, ***-нј-** у пазіцыі паміж галоснымі *(зелье, насенье);* захаванне або аглушэнне звонкіх зычных у канцавым становішчы *(воз, дуб, вос, дуп);* аглушэнне звонкіх зычных у сярэдзіне слова перад глухімі *(скаска, загатка);* губна-губны [*w*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы *(праwда, доwгі, купіw);* ужыванне словаформ *хлеў, хлêў, хлеw, хлêw* [хлеў]; канчаткі *-ем (-эм), -ём* назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне *(конем, ножэм, ейцэм; конём, рублём);* канчатак *-эй* назоўнікаў жаночага роду множнага ліку першага скланення ў родным склоне *(бабэй, головэй, дорогэй, стрэхэй, хатэй, ямэй);* націскныя і ненаціскныя канчаткі *-ая, -я* прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молодая, старая, молода, стара; добрая, новая, добра, нова);* націскныя і ненаціскныя канчаткі *-ее, -э* прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молодэе, старэе, молодэ, старэ; новэе, солодкэе, хорошэе, новэ, солодкэ, хорошэ);* формы асабова-ўказальных займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *вон, вона, воно, воны; он, она, оно, оны;* формы інфінітыва з асновай на галосны з фанематычным варыянтам суфікса *-ці -ті (ходіті, робіті, спаті);* формы інфінітыва з асновай на [*к*] *(пекте, пекце; секті, секці);* формы *ход'іт, ход'ат* дзеясловаў другога спражэння ў трэцяй асобе адзіночнага і множнага ліку з націскам на аснове; формы *пэкут, стрыгут, пэчут* дзеясловаў першага спражэння з асновай на [*г*], [*к*] у трэцяй асобе множнага ліку і інш.

У XVI–XVII стст. на Беларусі пашырыліся мястэчкі, якія сумяшчалі ў сабе рысы горада і вёскі. Яны з'яўляліся эканамічнымі цэнтрамі навакольных акруг. Пазней найбольш значным мястэчкам Выганаўскага Палесся, яго "сталіцай" сталі Целяханы. Першае ўпамінанне аб Целяханах у пісьмовых крыніцах адносіцца да 1554 г. Статус мястэчка населены пункт атрымаў у XVII ст. [47, с. 98; 48, с. 460; 49, с. 214]. Спецыфічная гаворка Целяхан, якая істотна адрозніваецца ад гаворак суседніх паселішчаў, відавочна, фарміравалася ў працэсе станаўлення гэтага населенага пункта

як мястэчка. Па меркаванні некаторых даследчыкаў, у Целяханах, магчыма, захавалася гарадзішча (раскопкі не праводзіліся), што адносіцца прыкладна да VI–XIII стст. [10, карта № VI]. Гарадзішча, калі яно існавала, магло быць цэнтрам для невялікай акругі. Ужо тады магла, відаць, фарміравацца спецыфічная гаворка ў паселішчы, якое знаходзілася на месцы сучаснага гарадзішча.

Такім чынам, гаворка мястэчка Целяханы выступае як выразна акрэсленая дыялектная адзінка даўняга ўтварэння, якая адасобілася ад іншых груп.

## Валішчанска-аброўскія гаворкі

Валішчанска-аброўскія гаворкі пашыраны ў двух невялікіх арэалах, усходнім (асноўным) і заходнім, што размешчаны на паўднёвы ўсход (пераважна) і захад (гаворка в. Аброва) ад мястэчка Целяханы. Большасць з іх (акрамя гаворкі в. Аброва) бытуе на ўзмежжы Івацэвіцкага і Пінскага раёнаў. Валішчанска-аброўскія гаворкі як асобная дыялектная адзінка была выдзелена Ф.Д. Клімчуком у 1983 г. Як вядома, даследчык спачатку выдзеліў паўднёвацеляханскія і паўночналагішынскія гаворкі. Аднак погляды Ф.Д. Клімчука пры накапленні новых фактаў з цягам часу мяняліся. Пры апісанні паўднёвацеляханскіх гаворак была адзначана спецыфіка гаворак вв. Аброва і Клятная. Пазней гаворка в. Аброва аб’яднана навукоўцам з паўночналагішынскімі ў адну групу, якой аўтар даў новую назву – валішчанска-аброўскія гаворкі. Даследчыкі звычайна адносяць гэтыя гаворкі да берасцейска-пінскіх. Валішчанска-пінскія гаворкі суадносяцца з малецкім дыялектным тыпам [5, с. 11; 6; 25, с. 217; 26; 27; 30, с. 204].

На тэрыторыі даследуемага рэгіёна дадзеныя гаворкі мяжуюць з наступнымі дыялектнымі адзінкамі. Усходні арэал: на поўначы – з паўночнабрэсцкімі, на захадзе – з паўднёвацеляханскімі і сярэднезагародскімі, на поўдні і ўсходзе – з паўночназагародскімі гаворкамі. Заходні арэал: на поўначы – з паўночнабрэсцкімі, на ўсходзе – з паўднёвацеляханскімі, на захадзе і поўдні – з паўночназагародскімі, сярэднезагародскімі, паўднёвазагародскімі і тараканскімі гаворкамі (гл. рысунак 1).

Намі даследаваўся толькі асноўны, усходні арэал.

Валішчанска-аброўскія гаворкі аддзяляюцца ад паўночнабрэсцкіх, паўднёвацеляханскіх і сярэднезагародскіх значнай колькасцю ізаглос.

Валішчанска-аброўскім гаворкам характэрны наступныя асаблівасці: васьміфанемны склад галосных гукаў [*і*], [*ы*], [*е(э)*], [*ê*], [*а*], [*о*], [*ô*], [*у*]; галосны [*ô*] на месцы ***о*** ў новых закрытых складах пад націскам *(во̂з, но⊥с, сто̂л);* галосныя [*ê*], [*ы*$^{э}$] на месцы націскнога ***ѣ*** *(ле̂с, се̂но, сне̂г; л'ы$^{э}$с, с'ы$^{э}$но, сны$^{э}$г);* захаванне ***о*** ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных /о к а н н е/ *(голова, дорога, корова, молоко, се̂но, ле̂то, с'ы$^{э}$но, л'ы$^{э}$то, садок, трава* і інш.); галосныя [э], [*ы*$^{э}$] на месцы ***е***, ***ѣ*** ў першым пераднаціскным складзе пасля цвёрдых губных, цвёрдых і паўмяккіх пярэднеязычных ***д***, ***т***, ***з***, ***с***, ***н*** *(вэсна, бэда, мэшок; вы$^{э}$сна, бы$^{э}$да, мы$^{э}$шок; дэнёк, зэмля, сэло, д'энёк, з'эмля, с'эло; ды$^{э}$нёк, з'ы$^{э}$мля, с'ы$^{э}$ло);* галосныя [*е*], [э] на месцы ***ę*** ў пераднаціскным складзе ў лексемах *глядзеў, злякаўся, злякацца, заяц, памяць (гледев, гледів, злекавса, злекатіса, злекатыса, злекацца, заец, памэть);* вымаўленне галоснага [*і*] або захаванне ***ы*** ў націскным і першым пераднаціскным складзе пасля губных зычных *(бік, ві, віпі, вісоко, вісыпав, грыбі, мі, міш, помію, піл; бык, вы, выпі, высоко, высыпав, грыбы, мы,*

*мыш, помыю, пыл* і інш.); галосныя [*и*][3], [*ы˙*] на месцы націскнога ***ы** ў словах тыпу *сын, валы, рыба, дым (с˙ин, вол˙и, р˙иба; сы˙н, волы˙, ры˙ба);* цвёрдыя губныя перад ***е** /ва ўсіх пазіцыях/, ***ѣ** /у ненаціскных складах/ *(вэсна, выэсна, мэд, бэрог, вэчор /вэычор/, до мэнэ, пэршы, бэда, быэда, мэшок, мыэшок);* паўмяккія і мяккія губныя перад рэфлексамі ***і** (***и**) *(м˙иска, роб˙ит˙и; міска, робіты);* цвёрдыя і паўмяккія пярэднеязычныя (аднак ***л** паўмяккі і мяккі) перад рэфлексамі ***е**, ***і** (***и**) *(дэнь, дэнёк, дыэнёк, зэмля, сэло, тэпэр, тыэпэр, зыма, ходыты, тыхо; д˙энёк, з˙эмля, з˙ыэмля, с˙эло, с˙ыэло, т˙эпэр, з˙има, ход˙ит˙и, т˙ихо; пол˙э, л˙ипа; поле, ліпа);* мяккія [*д'*], [*т'*], цвёрдыя [*д*], [*т*] перад рэфлексамі націскнога ***ѣ** *(д'ед, т'ен', дыэд, тыэн');* цвёрдыя губныя і заднеязычныя перад канчаткам *-эй* у назоўніках жаночага роду множнага ліку роднага склону *(бабэй, головэй, ямэй, дорогэй, стрэхэй);* пераважна цвёрдыя, часам паўмяккія і мяккія заднеязычныя перад [э], [*е*] *(довгэе, довгэ, короткэе, короткэ, т˙ихэе, т˙ихэ, тыхэе; довг˙эе, довг˙э, коротк˙эе, коротк˙э, т˙их˙эе, т˙их˙э; довгейе, довге, короткее, коротке, т˙ихее, т˙ихе);* мяккія, паўмяккія і цвёрдыя зычныя перад рэфлексамі націскнога ***ѣ** *(вётер, ветер, лёс, сёно, снёг; л˙ыэс, с˙ыэно; выэтёр, сныэг* і інш.); пераважна цвёрдыя зычныя перад рэфлексамі ***о** ў новых закрытых складах пад націскам *(вôз, вôл, коровка, нôс, стôл, кôнь);* паўмяккія і мяккія заднеязычныя у гістарычных спалучэннях ***гы**, ***кы**, ***хы** *(довг˙и, коротк˙и, т˙их˙и; довгі, короткі, тыхі);* мяккі [*т'*], цвёрды [*т*] на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку *(ход˙ит', ходыт', ход'ат'; ход˙ит, ход'ат);* наяўнасць паўмяккага або толькі цвёрды зычны ***р** *(гр˙ад, гр˙эх, пор˙адок, пор˙эзав, р˙эчка, кор˙эвка; град, грэх, порадок, порэзав, рэчка, коровка, коровка* і інш.); наяўнасць паўмяккіх або толькі цвёрдыя шыпячыя *(ж˙ито, на мыэж˙и; жар, жыто, на мэжэ, шапка);* наяўнасць паўмяккага і пазіцыйна абмежаванага гістарычнага мяккага ***ц** *(хлопц˙и; цівка);* падоўжаныя зычныя [*л'л'*], [*н'н'*] на месцы спалучэнняў ***-лј-**, ***-нј-** у пазіцыі паміж галоснымі *(зелле, насенне, з˙ыэлле, нас˙ыэнне);* захаванне звонкіх зычных у канцавым становішчы *(вôз, воз, дуб);* пераважна аглушэнне, часам захаванне звонкіх зычных у сярэдзіне слова перад глухімі *(каска, скаска, загатка; загадка);* губна-губны [*w*], губна-зубны [*v*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы *(праwda, доwгі, доwг˙и, купіw, куп˙иw; праvda, доvг˙и, куп˙иv);* эпентычны зычны [*н'*] перад гістарычным націскным ***ę** пасля ацвярдзелага губнога ***м** *(мнясо, мнята, помняв, темне, тыэмне);* канчаткі *-ем (-эм), -ём (-ом)* назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне *(конем, рублем, ножэм, ейцэм, яйцэм; конём, рублём, ножом);* канчаткі -э, -э̂, *-и* назоўнікаў мужчынскага роду адзіночнага ліку другога скланення з асновай на зацвярдзелы зычны ў месным склоне *(на двор˙э, на концэ; на дворэ̂, на концэ̂; на двор˙и, на конц˙и);* канчаткі -э, -э̂, *-и* назоўнікаў жаночага роду адзіночнага ліку першага скланення з асновай на зацвярдзелы зычны ў месным склоне *(на мэжэ, на мэжэ̂; на мэж˙и);* канчаткі *-и, -ы, -і* назоўнікаў жаночага, мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку першага і другога скланення з цвёрдай і мяккай асновай ў месным склоне *(у (в) хат˙и, у (в) лес˙и, л˙ыэс˙и, у (в) нос˙и, у (в) пол˙и; (в) хаты, у (в) полы; у (в) лесі, у (в) носі, у (в) полі);* формы агульных назоўнікаў і ўласных імёнаў жаночага роду адзіночнага ліку ў клічным склоне *(бабо, мамо; мама, Маня, Валя);* канчатак *-эй* назоўнікаў жаночага роду множнага ліку першага скланення ў родным склоне *(бабэй, головэй, дорогэй, стрэхэй, хатэй, ямэй);* канчатак *-ям* назоўнікаў мужчынскага роду

[3] [*и*] – галосны верхняга пад'ёму сярэдняга рада (сярэдні паміж *і* і *ы*).

множнага ліку другога скланення ў давальным склоне *(коням, людям);* націскны і ненаціскны канчатак *-и, -ы* прыметнікаў мужчынскага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молод'и, мал'и, стар'и, молоды, малы, стары, добр'и, нов'и, хорош'и, добры, новы, хорошы);* націскныя і ненаціскныя канчаткі *-ая, -а* прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молодая, старая, молода, стара; добрая, новая, добра, нова);* пераважна націскны канчатак *-эе,* часам – *-э* прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молодэе, старэе; молодэ, старэ);* ненаціскныя канчаткі *-эе (-ее), -э (-е)* прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(новэе, новее, солодкэе, солодкее, хорошэе; новэ, нове, солодкэ, солодке, хорошэ);* формы займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *вôн, вон, вона, воно, воны;* формы інфінітыва з асновай на галосны з фанематычнымі варыянтамі суфікса *-ці -т'и, ты (ход'ит'и, роб'ит'и, спат'и; ходыты, робыты, робіты, спаты);* формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве з постфіксам *-са (брат'иса, братыса, зват'иса, званыса, роб'ит'иса, робітыса, ум'иват'иса, умыватыса);* формы інфінітыва з асновай на [*к*] *(пэкте, сэкте; пэкт'и, сєкт'и, сэкт'и);* формы дзеясловаў *хадзіць насіць* у першай асобе адзіночнага ліку *(ходю, носю);* цвёрды зычны [*с*] у зваротнай форме дзеяслова *(боюса, купаюса, боявса, купавса, зроб'илосо, зробілоса /зроб'илос/);* формы *ход'ит', ходыт', ход'ат', ход'ит, ход'ат* дзеясловаў другога спражэння ў трэцяй асобе адзіночнага і множнага ліку з націскам на аснове; пераважна формы *пэчуть, пэчут, стрыжуть, стр'ижуть,* часам – *пэкут, стр'игут* дзеясловаў першага спражэння з асновай на [*г*], [*к*] у трэцяй асобе множнага ліку і інш.

Такім чынам, валішчанска-аброўскія гаворкі выступаюць як выразна акрэсленая дыялектная адзінка даўняга ўтварэння, якая адасобілася ад іншых груп.

## Сярэднезагародскія гаворкі

Сярэднезагародскія гаворкі пашыраны на значнай тэрыторыі Заходняга Палесся: ад Берасця на захадзе і амаль да Століна на ўсходзе. Яны ўтвараюць некалькі масіваў і астравоў. Найбольш значныя масівы дадзеных гаворак – брэсцка-камянецка-кобрынскі і пінска-заходнестолінскі. Прыкметныя тэрытарыяльныя абшары сярэднезагародскіх гаворак адзначаны ў Драгічынскім і Іванаўскім раёнах, а таксама яны характэрны некаторым населеным пунктам на паўночным захадзе Пінскага і на захадзе Лунінецкага раёнаў. Сярэднезагародскія гаворкі як адзін з чатырох асобных дыялектных тыпаў (разнавіднасцяў) заходнепалескіх, або загародскіх, гаворак былі выдзелены Ф.Д. Клімчуком у 1983 г. Гэтыя гаворкі суадносяцца з паўднёвапалескім дыялектным тыпам [5, с. 22–24; 25, с. 217; 26; 27; 30, с. 206–208; 33].

На тэрыторыі Выганаўскага Палесся намі даследавана сярэднезагародская гаворка в. Сакалоўка, якая размешчана на поўдні рэгіёна.

На тэрыторыі даследуемага рэгіёна сярэднезагародскія гаворкі на поўначы мяжуюць з паўднёвацеляханскімі, на ўсходзе – з валішчанска-аброўскімі, на захадзе – з паўднёвазагародскімі гаворкамі (гл. рысунак 1).

Дадзеныя гаворкі аддзяляюцца ад паўднёвацеляханскіх і валішчанска-аброўскіх значнай колькасцю ізаглос.

Сярэднезагародскай гаворцы в. Сакалоўка ўласцівы наступныя адметнасці: шасціфанемны склад галосных гукаў [*і*], [*ы*], [*е(э)*], [*а*], [*о*], [*у*]; галосны [*ы*] на месцы

*о ў новых закрытых складах пад націскам *(выз, ныс, стыл);* галосны [*і*] на месцы націскнога *ѣ *(ліс, сіно, сніг);* захаванне *о ў ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных /о к а н н е/ *(голова, дорога, корова, молоко, сіно, літо, садок, трава* і інш.); галосны [*ы*] на месцы *о ў прыназоўніку *пад (пыд);* галосны [э] на месцы *е, *ѣ ў першым пераднаціскным складзе пасля цвёрдых губных і пярэднеязычных *д, *т, *з, *с, *н *(вэсна, бэда, мэшок, дэнёк, зэмля, сэло);* галосныя [*е*], [э] на месцы *ę ў пераднаціскным складзе ў лексемах *глядзеў, злякаўся, злякацца, заяц, памяць (гледів, злекавса, злекатыса, заец, памэть);* захаванне *ы ў націскным і першым пераднаціскным складзе пасля губных зычных *(бык, вы, выпы, высоко, высыпав, грыбы, мы, мыш, помыю, пыл* і інш.); галосны [*ы˙*] на месцы націскнога *ы ў словах тыпу *сын, валы, рыба, дым (сы˙н, волы˙, ры˙ба);* цвёрдыя губныя перад рэфлексамі *е /ва ўсіх пазіцыях/, *ѣ /у ненаціскных складах/, *і *(вэсна, мэд, бэрог, вэчор до мэнэ, пэршы, бэда, мэшок, мыска, робыты);* цвёрдыя пярэднеязычныя перад рэфлексамі *е, *і *(дэнь, дэнёк, зэмля, сэло, тэпэр, полэ, лыпа, зыма, ходыты, тыхо);* мяккія [*д'*], [*т'*] перад рэфлексамі націскнога *ѣ і на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку *(д'ід, т'ін'; ходыт', ход'ат');* цвёрдыя губныя і заднеязычныя перад канчаткам *-эй* у назоўніках жаночага роду множнага ліку роднага склону *(бабэй, головэй, ямэй, дорогэй, стрэхэй);* цвёрдыя заднеязычныя перад [э] *(довгэе, довгэ, короткэе, короткэ, тыхэе, тыхэ);* захаванне гістарычных спалучэнняў *гы, *кы, *хы *(довгы, короткы, тыхы);* наяўнасць мяккага і паўмяккага зычнага *р *(гріх, порізав, річка, на двор˙и* і інш.); толькі цвёрдыя шыпячыя *(жар, жыто, на мэжэ, шапка);* наяўнасць пазіцыйна абмежаванага гістарычнага мяккага *ц *(цівка);* падоўжаныя зычныя [*л˙л'*], [*н'н'*] на месцы спалучэнняў *-лј-, *-нј- у пазіцыі паміж галоснымі *(зілле, насінне);* захаванне звонкіх зычных у канцавым становішчы і ў сярэдзіне слова перад глухімі *(выз, дуб, казка, загадка);* губна-зубны [*v*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы *(правда, доvгы, купыv);* эпентычны зычны [*н'*] перад гістарычным націскным *ę пасля ацвярдзелага губнога *м *(мнясо, мнята, помняв, тімне);* канчаткі *-ем (-эм), -ом* назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку другога скланення з мяккай і зацвярдзелай асновай у творным склоне *(конем, рублем, яйцэм; ножом, яйцом);* канчаткі *-э, -и, -ы* назоўнікаў мужчынскага роду адзіночнага ліку другога скланення з асновай на зацвярдзелы зычны ў месным склоне *(на дворэ, на концэ; на двор˙и, на концы);* канчаткі *-э, -ы* назоўнікаў жаночага роду адзіночнага ліку першага скланення з асновай на зацвярдзелы зычны ў месным склоне *(на мэжэ; на мэжы);* канчатак *-ы* назоўнікаў жаночага, мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку першага і другога скланення з цвёрдай і мяккай асновай ў месным склоне *(у (в) хаты, у (в) лісы, у (в) носы, у (в) полы);* формы агульных назоўнікаў і ўласных імёнаў жаночага роду адзіночнага ліку ў клічным склоне *(бабо, мамо; мама, Маня, Валя);* канчатак *-эй* назоўнікаў жаночага роду множнага ліку першага скланення ў родным склоне *(бабэй, головэй, дорогэй, стрэхэй, хатэй, ямэй);* націскны і ненаціскны канчатак *-ы* прыметнікаў мужчынскага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молоды, малы, стары, добры, новы, хорошы);* націскныя і ненаціскныя канчаткі *-ая, -а* прыметнікаў жаночага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молодая, старая, молода, стара; добрая, новая, добра, нова);* націскныя і ненаціскныя канчаткі *-эе, -э* прыметнікаў ніякага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне *(молодэе, старэе, молодэ, старэ; новэе, солодкэе, хорошэе, новэ, солодкэ, хорошэ);* формы займеннікаў трэцяй асобы мужчынскага, жаночага і ніякага роду адзіночнага і множнага ліку *вын, вона, воно, воны;*

формы інфінітыва з асновай на галосны з фанематычным варыянтам суфікса *-ці -ты (ходыты, робыты, спаты);* формы зваротных дзеясловаў у інфінітыве з постфіксам *-са (братыса, звятыса, мытыса, робытыса);* формы інфінітыва з асновай на [*к*] *(пэкты, сэкты);* формы дзеясловаў *хадзіць насіць* у першай асобе адзіночнага ліку *(ходю, носю);* цвёрды зычны [*с*] у зваротнай форме дзеяслова *(боюса, купаюса, боявса, купавса, зробылосо);* формы *ходыт', ход'ат'* дзеясловаў другога спражэння ў трэцяй асобе адзіночнага і множнага ліку з націскам на аснове; формы *пэкуть, стрыгуть* дзеясловаў першага спражэння з асновай на [*г*], [*к*] у трэцяй асобе множнага ліку і інш.

Такім чынам, у межах Выганаўскага Палесся сярэднезагародскія гаворкі выступаюць як частка выразна акрэсленаяй дыялектнай адзінкі даўняга ўгварэння.

Акрамя дыялектных груп і падгруп, пры чляненні гаворак пэўнай мовы або рэгіёна выкарыстоўваюцца такія катэгорыі, як дыялектная зона і дыялектная мікразона. У межах Выганаўскага Палесся вылучаецца Целяханская мікразона. Яна ўключае цэнтральнацеляханскую падгрупу паўночнабрэсцкіх гаворак і паўднёвацеляханскую групу гаворак. Для гэтай дыялектнай мікразоны характэрны наступныя асаблівасці: рэфлекс ***о** > [*э̂*(*ê*)] у новых закрытых складах пад націскам *(вэ̂з, вêз, нэ̂с, стэ̂л, кор э̂вка);* пераважна галосны [*ы*] на месцы ***о** ў прыназоўніку *пад (пыд);* пераважна ўжыванне словаформ *хлêw, хлеw* [хлеў]; галосныя [*е*], [э] на месцы ***ę** ў пераднаціскным і паслянаціскным складзе ў лексемах *глядзеў, злякаўся, злякацца, заяц, памяць (гледзев, гледев /гледзеў, гледз$^{д}$ев/, злекавса, злекацца, злекаціса, злекатіса, заец, памэць, памець, памэть /памэц$^{ть}$ь/);* пераднаціскны галосны [*е*] у словаформе *яйцом (ейцэм);* пераважна цвёрды [*т*] на канцы дзеясловаў у форме трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку *(ходз'іт, ходз'ат /ходз$^{д}$'іт, ходз$^{д}$'ат/ ход'іт, ход'ат);* пераважна губна-губны [*w*] у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцавым становішчы *(праwда, доwгі, купіw);* формы інфінітыва з асновай на галосны з суфіксамі *-ці, -ті (ходзіці, робіці, спаці; ходіті, робіті, спаті);* пераважна формы *ходз'іт, ходз'ат /ходз$^{д}$'іт, ходз$^{д}$'ат/ ход'іт, ход'ат* дзеясловаў другога спражэння ў трэцяй асобе адзіночнага і множнага ліку з націскам на аснове.

Адзначым, што ізаглосы, якія выдзяляюць Целяханскую дыялектную мікразону, таксама часткова акрэсліваюць цэнтральнацеляханскую падгрупу і паўднёвацеляханскую групу гаворак.

Такім чынам, на аснове праведзеных пучкоў ізаглос пацверджана правамернасць вылучэння груп (падгруп) гаворак, якія папярэдне былі выдзелены намі і іншымі даследчыкамі. Наяўнасць шматлікіх дыялектных адзінак на тэрыторыі Выганаўскага Палесся з'яўляецца вынікам працяглых міждыялектных кантактаў і ўзаемаўплываў, адасобленасці прыроднымі межамі асобных густа заселеных мікрарэгіёнаў, міграцыйных і мікраміграцыйных працэсаў.

Спіс абследаваных населеных пунктаў (гл. рысунак 1): 1. Гічыцы, 2. Жытлін, 3. Вулька Аброўская, 4. Козікі, 5. Вяда, 6. Тупічычы, 7. Бабровічы, 8. Выганашчы, 9. Раздзялавічы, 10. Вялікая Гаць, 11. Малая Гаць, 12. Святая Воля, 13. Доўгая, 14. Целяханы, 15. Вулька Целяханская, 16. Соміна, 17. Турная, 18. Горталь, 19. Гутка, 20. Краі, 21. Гошча, 22. Азарычы, 23. Рэчкі, 24. Сакалоўка, 25. Валішча, 26. Трасцянка, 27. Панкі, 28. Карацк, 29. Першамайская, 30. Ушкавіца, 31. Субаты, 32. Сіманавічы, 33. Рухча, 34. Пагост.

# Літаратура


1. Нарысы па беларускай дыялекталогіі : вучэб. дапаможнік для філал. фак. ун-таў і педін-аў / рэдкал.: Р. І. Аванесаў [і інш.] ; пад рэд. Р. І. Аванесава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1964. – 415 с.
2. Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак / Р. І. Аванесаў [і інш.] ; пад рэд. Р. І. Аванесава, К. К. Атраховіча (Крапівы), Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 80 карт.
3. Блінава, Э. Д.: Беларуская дыялекталогія : вучэб. дапаможнік для філал. фак. ВНУ / Э. Д. Блінава, Е.С. Мяцельская. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск : Выш. школа, 1980. – 304 с. : карты.
4. Вайтовіч, Н. Т.: Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі / Н. Т. Вайтовіч ; рэд. Р. І. Аванесаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 220 с.
5. Клімчук, Ф. Д.: Гаворкі Заходняга Палесся : Фанетычны нарыс / Ф. Д. Клімчук; пад рэд. М. І. Талстога. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 128 с.
6. Клімчук, Ф. Д.: Гаворкі Берасцейска-Пінскага Палесся і Падляшша як вынік гістарычнага развіцця / Ф. Д. Клімчук // Pogranicze. – Lublin, 2003. – T. 3. – S. 245–256, карты № 1, 2.
7. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы / Ю. Ф. Мацкевіч [і інш.] ; пад рэд. Р. І. Аванесава, К. К. Атраховіча (Крапівы), Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск : Выд-тва АН БССР, 1963. – VIII + 338 карт.
8. Лексічны атлас беларускіх народных гаворак : у 5 т. / рэдкал.: Ф. Д. Клімчук [і інш.]; пад рэд. М. В. Бірылы, Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск : 1993–1998. – 5 т.
9. Клімчук, Ф. Д.: Паўднёва-заходнія ізаглосы / Ф. Д. Клімчук // Лексічныя ландшафты Беларусі: Жывёльны свет. / І. Я. Яшкін [і інш.]; навук. рэд. Ф. Д. Клімчук, І. Я. Яшкін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – С. 180–196.
10. Самуйлік, Я. Р.: Гаворкі Выганаўскага Палесся : лінгвістычны атлас для студ. філал. фак. ун.-та / Я. Р. Самуйлік ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна, Філал. фак., Каф. гіст. беларус. мовы і дыялекталогіі. – Брэст : БрДУ, 2009. – 199 с.
11. Самуйлік, Я. Р.: Некаторыя асаблівасці гаворак Выганаўскага Палесся / Я.Р. Самуйлік // Беларуская лінгвістыка. – 1987. – Вып. 32. – С. 49–55.
12. Самуйлік, Я. Р.: Асаблівасці гаворак Выганаўскага Палесся / Я. Р. Самуйлік // Науково-технічна революція і сучасні процеси розвитку лексики україньскої народно-розмовної мови : тези доповідей Респ. конф., Ужгород, 14–16 листоп. 1989 г. / МВіССО УРСР, Ужгородськ. держ. ун-т, АН УРСР, Ін-т мовознавства ; редкол.: Й. О. Дзендзелівський (відп. ред.) [та ін.]. – Ужгород, 1989. – С. 128.
13. Самуйлік, Я. Р.: Некаторыя асаблівасці лексічнай намінацыі гаворак Выганаўскага Палесся / Я. Р. Самуйлік // Словообразование и номинативная деривация в славянских языках : материалы VI междунар. науч. конф., Гродно, 28–29 мая 1998 г. : в 2 ч. / Гродн. гос. ун-т ; С. А. Емельянова (отв. ред.). – Гродно, 1998. – Ч. 1. – С. 204–206.
14. Самуйлік, Я. Р.: Целяханская падгрупа паўночнабрэсцкіх гаворак / Я. Р. Самуйлік // Жыццём слугуючы Айчыне : матэрыялы навук. канф. да 80-х угодкаў прафесара Ф. Янкоўскага, Брэст, 19 лістап. 1998 / Брэсц. дзярж. ун-т ; рэдкал.: М. М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст, 1999. – С. 77–79.
15. Самуйлік, Я. Р.: Асаблівасці пазіцыйнага ўжывання *д, *т у гаворках Выганаўскага Палесся і наваколляў / Я. Р. Самуйлік // Сучасні проблеми мовознавства та літературознавства : міжнарод. конф. на честь 80-річчя проф. Йосипа Дзендзелівського. Зб. наук. праць. – Вип. 4. Українське і слов'яньске мовознавство. – Ужгород, 2001. – С. 470.
16. Самуйлік, Я. Р.: Цэнтральнацеляханская група гаворак Выганаўскага Палесся (этналінгвістычна-гістарычная інтэрпрэтацыя) / Я.Р. Самуйлік // Берасцейска-Пінскае Палессе : мова, літаратура, гісторыя : матэрыялы рэсп. навук. канф., прысвеч. 80-годдзю з дня нараджэння У. Калесніка, Брэст, 24–25 кастр. 2002 г. / Брэсц. дзярж. ун-т ; рэдкал.: М.М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст, 2002. – С. 97–100.
17. Самуйлік, Я. Р.: Гаворкі Выганаўскага Палесся ў сістэме беларускай мовы / Я.Р. Самуйлік // Славянские языки : системно-описательный и социокультурный аспекты исследования :

матэрыялы респ. науч.-метод. конф., Брест, 12–13 нояб. 2003 г. / Брест. гос. ун-т. ; редкол.: С. А. Королевич [и др.]. – Брест, 2004. – С. 80–82.
18. Самуйлик, Я. Г.: Гаворкі Выганаўскага Палесся ў міждыялектным асяроддзі / Я. Г. Самуйлик // Вісник Житомирського педагогічного університету. – 2004. – Вип. 14. – С. 152–154.
19. Самуйлік, Я. Р.: Структура лексічных карт "Атласа народных гаворак Выганаўскага Палесся" / Я. Р. Самуйлік // Мовы ў Вялікім княстве Літоўскім і краінах сучаснай Цэнтральнай і Усходняй Еўропы: традыцыі і пераемнасць : матэрыялы IV міжнар. навук. канф., Брэст, 18–19 мая 2004 г. / Брэсц. дзярж ун-т, Беларус. дзярж. ун-т, Будапешцкі ун-т ; рэдкал.: М.М. Аляхновіч [і інш.] – Брэст, 2005. – С. 212–214.
20. Самуйлік, Я. Р.: Міждыялектныя сувязі гаворак Выганаўскага Палесся / Я. Р. Самуйлік // Діалектологічні студії. 6: Лінгвістичний атлас – від створення до интерпретації / Відп. ред. П. Гриценко, Н. Хобзей. – Львів : Інстытут українознавства ім. Крип'якевича НАНУ, 2006. – С. 115–125.
21. Самуйлік, Я. Р.: Панямонскія (гродзенска-баранавіцкія) пучкі ізаглос у "Атласе народных гаворак Выганаўскага Палесся" / Я. Р. Самуйлік // Поліські зворини : зб. пам'яті проф. Миколи Васильовича Никончука. – Житомир : Вид-во ЖДУ им. І. Франка, 2007. – С. 152–176.
22. Самуйлік, Я. Р.: Лінгвагеаграфія гаворак Выганаўскага Палесся / Я.Р. Самуйлік / Имя и слово (проблемы семантико-прагматического взаимодействия в славянских языках) : материалы междунар. науч. конф., Брест, 19–20 апр. 2007 г. : в 2 ч. / Брест. гос. ун-т, Akademia Podlaska w Siedlcach; редкол.: В.И. Сенкевич [и др.]. – Брест, 2007. – Ч. 2. – С. 299–302.
23. Самуйлік, Я. Р.: Панямонска-цэнтральнацеляханскі пучок ізаглос (па матэрыялах "Атласа народных гаворак Выганаўскага Палесся") / Я.Р. Самуйлік // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. філалагічных навук. Літаратуразнаўства. Мовазнаўства. – 2008. – № 1 (9). – С. 95–102.
24. Самуйлік, Я. Р.: Гродзенска-баранавіцкія пучкі ізаглос у "Атласе народных гаворак Выганаўскага Палесся" / Я.Р. Самуйлік // Беларуская лінгвістыка. – 2008. – Вып. 61. – С. 53–60.
25. Самуйлік, Я. Р.: Загародска-центральнацеляханскі пучок ізаглос у лінгвістычным атласе "Гаворкі Выганаўскага Палесся" / Я.Р. Самуйлік // Волинь філологічна : текст і контекст. Західнополіські говірки в просторі та часі : зб. наук. пр. / Волин. нац. ун-т ім. Лесі Українки ; упорядкування Г.Л. Аркушина. – Луцьк, 2010. – Вип. 9. – С. 216–230.
26. Климчук, Ф. Д.: Диалектные типы Полесья на общеславянском фоне / Ф.Д. Климчук // Славянские этюды : сб. к юбилею С.М. Толстой / Российская Академия наук. Институт славяноведения ; редкол.: Е.Е. Левкиевская (отв. ред.) [и др.]. – М. : Индрик, 1999. – С. 214–227.
27. Климчук, Ф. Д.: Диалектные типы Полесья / Ф.Д. Климчук // Слово и культура : памяти Н. И. Толстого : сб. ст. в 2 т. / Российская Академия наук. Институт славяноведения ; редкол.: Т. А. Агапкина (ред.) [и др.]. – М. : Индрик, 1998. – Т. 1. – С. 118–135.
28. Республика Беларусь. Брестская область. Общегеографический атлас / ред. Н.И. Шлык. – Минск : РУП «Белкартография», 2003. – 32 с.
29. Беларуская мова : энцыкл. / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.] ; пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск : БелЭн, 1994. – 665 с. : іл.
30. Крывіцкі, А. А.: Дыялекталогія беларускай мовы : дапам. / А. А. Крывіцкі. – Мінск : Выш. шк., 2003. – 294 с.
31. Крывіцкі, А. А.: Фанетыка беларускай мовы : вучэб. дапаможнік для філфакаў ВНУ / А. А. Крывіцкі, А.І. Падлужны. – Мінск : Выш. шк., 1984. – 269 с., іл.
32. Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак / Р. І. Аванесаў [і інш.] ; пад рэд. Р.І. Аванесава, К. К. Атраховіча (Крапівы), Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – 320 с.
33. Самуйлік, Я. Р.: Гаворкі Верхняга Над'ясельдзя / А.А. Босак, В. М. Босак. – Мінск, 2007. – 134 с.
34. Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – 702 с. : іл.

35. Археалогія Беларусі : у 4 т. – Т. 1 : Каменны і бронзавы вякі / Э.М. Зайкоўскі [і інш.] ; пад рэд. М.М. Чарняўскага. – Мінск : Беларуская навука, 1997. – 424 с. : іл.
36. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. – Т. 4 : Кадэты – Ляшчэня. – 1997. – 432 с. : іл.
37. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. – Т. 5 : М – Пуд. – 1999. – 592 с. : іл.
38. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. – Т. 1 : А–К / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – 496 с. : іл.
39. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. – Т. 2 : Л–Я / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – 464 с. : іл.
40. Вялікі гістарычны атлас Беларусі : у 3 т. – Т. 1 : Храналогія: ад старажытнасці да 1569 г. / рэдкал.: Г.І. Кузняцоў [і інш.]. – Мінск : "Белкартаграфія", 2009. – 247 с.
41. Климчук, Ф.: Очерк древней и средневековой истории Пинщины / Фёдор Климчук // Гістарычная брама. Гісторыя і культура Палесся. – 2009. – № 1 (24). – С. 3–23.
42. Кухаренко, Ю. В.: Средневековые памятники Полесья / Ю. В. Кухаренко // Археология СССР. Свод археологических источников / АН СССР. Ин-т археологии ; под общ. ред. Б. А. Рыбакова. – М. : Изд-во АН СССР, 1961. – Вып. Е 1-57. – 40 с. + 14 таблиц.
43. Штыхов Г .В.: Археологическая карта Белоруссии. Памятники железного века и эпохи феодализма / Г.В. Штыхов ; под ред. Ф. В. Борисевича. – Мінск : Полымя, 1971. – Вып. 2. – 276 с.
44. Поболь, Л. Д.: Археологические памятники Белоруссии. Железный век / Л.Д. Поболь ; науч. ред. М.А. Ткачев. – Минск : Наука и техника, 1983. – 456 с., ил.
45. Климчук, Ф. Д.: Некоторые дискуссионные вопросы средневековой истории Надъясельдя и Погорынья / Ф. Д. Климчук // Palaeoslavica, XII. – Cambridge–Massachustns [USA], 2004. – № 1.– С. 5–28.
46. Памяць: Гістор.-дакум. хроніка Драгічынскага р-на / Беларускае тэлеграфнае агенцтва ; рэдкал.: Я.Я. Аляксейчык [і інш.]. – Мінск : БелТА, 1997. – 575 с.
47. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал. Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996–2004. – Т : 17 : Хвінявічы – Шчытні. – 2003. – 512 с.: іл.
48. Гарады і раёны Берасцейшчыны: гісторыя і сучаснасць. Івацэвіцкі раён / У. В. Здановіч [і інш.] ; пад агул. рэд. А. А. Гарбацкага. – Брэст : ААТ "Брэсцкая друкарня", 2009. – 564 с., фотаздымкі.
49. Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область / АН БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фальклора, Белорус. Сов. Знцикл. ; редкол.: С. В. Марцелев (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелСЭ, 1990. – 424 с.